

# МУЗЕЯЗНАЎСТВА

*І. Н. КОЛАБАВА*

## НУМІЗМАТЫЧНЫЯ КАЛЕКЦЫІ Ў КУЛЬТУРНА-АДУКАЦЫЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ РЭГІЯНАЛЬНЫХ МУЗЕЯЎ

*Асвятляюцца асноўныя этапы гісторыі прыватнага і музейнага нумізматычнага збіральніцтва, развіццё навуковай нумізматыкі Беларусі; аналізуюцца праблемы захавання, папулярызацыі і выкарыстання нумізматычных збораў у культурна-адукацыйнай дзейнасці рэгіянальных музеяў Беларусі; прыводзіцца станоўчы вопыт некаторых рэгіянальных музеяў краіны ў справе апрацоўкі і папулярызацыі нумізматычных калекцый.*

Тэрыторыя Беларусі – унікальны рэгіён, дзе пад уплывам гістарычных і геаграфічных фактараў сыходзіліся шляхі грашовых сістэм шматлікіх краін Еўропы і Азіі. Помнікі грашовага абарачэння заўсёды займаюць ганаровае месца ў музейных экспазіцыях. Манету невыпадкова называюць металічным люстэркам часу. Інфармацыя, што ўтрымліваецца ў ёй, дазваляе зацікавіць наведвальнікаў і разглядзець эканамічныя, сацыяльныя і культурныя аспекты гісторыі рэгіёна.

Значная колькасць рэгіянальных музеяў Беларусі маюць у сваіх фондах нумізматычныя калекцыі. Выкарыстанне помнікаў грашовага абарачэння ў разгортванні ўсіх формаў культурна-адукацыйнай дзейнасці музея немагчыма без ведання інфармацыі па гісторыі прыватнага і музейнага нумізматычнага калекцыяніравання і развіцця навуковай нумізматыкі, без уключэння ў адпаведныя экспазіцыйныя раздзелы нумізматычных помнікаў манет і манетных скарбаў.

У сувязі з гэтым узнікаюць праблемы фарміравання нумізматычнага збору, захавання, чысткі і кансервацыі, атрыбуцыі і экспанавання асобных манет і манетных скарбаў. Кожны з гэтых этапаў мае сваю спецыфіку і з'яўляецца даволі адказным і складаным.

Праблемы, у першую чаргу, выкліканы тым, што манеты з высакародных металаў і ўсе скарбы, як непадзельныя комплексы, уключаюцца ў групу музейных прадметаў, што ўтрымліваюць каштоўныя металы. Наяўнасць у музеі такіх прадметаў патрабуе дадатковага кантролю і справаздачнасці. Для фарміравання музейнага нумізматычнага збору неабходна правільнае вызначэнне напрамкаў гэтага працэсу.

Захаванне помнікаў гісторыі грашовага абарачэння немагчыма без стварэння ўмоў – сістэмы аховы ў экспазіцыі і месцы знаходжання нумізматычнай калекцыі, спецыяльнага памяшкання, а таксама адпаведных рэжымаў; неабходныя ўмовы патрабуюць і папяровыя грошы. Чыстка і кансервацыя манет, як вельмі адказны працэс, у адпаведнасці з заканадаўствам, праводзіцца з абавязковым удзелам спецыяліста.

Атрыбуцыя манет і манетных скарбаў патрабуе глыбокага ведання тэорыі, практычных навыкаў вызначэння манет, а таксама разнастайнай навуковай і даведачнай літаратуры [1; 4; 10–12; 14–16]. Да гэтай работы павінны далучацца «вузкія» спецыялісты, што па розных прычынах даволі праблематычна, асабліва для невялікага музея.

Пры правядзенні экскурсіі ад экскурсавода патрабуецца не толькі веданне гісторыі грашовага абарачэння на тэрыторыі Беларусі, але і выкарыстанне фактаў адлюстравання тэмы грошай у фальклоры, мастацтве, народных традыцыях і прыкметах.

У цэлым экспазіцыя сучаснага краязнаўчага музея, асвятляючы агульны гістарычны працэс, павінна падкрэсліваць адметнасць і непаўторнасць рэгіянальных асаблівасцей, якія магчыма ўзмацніць пры звароце да мясцовых нумізматычных помнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Станаўленню нумізматыкі як спецыяльнай гістарычнай дысцыпліны, што вывучае гісторыю грашовых сістэм і грашовага абарачэння, папярэднічаў даволі працяглы перыяд накаплення фактычнага матэрыялу – калекцыяніравання манет. Традыцыя збірання манет устанаўлівалася з антычных часоў, калі манеты разглядалі не толькі як сродкі грашовага абарачэння, а як прадметы, што маюць эстэтычнае значэнне.

У сярэдзіне XVI ст. у Еўропе з'яўляюцца мюнцкабінеты (манетныя кабінеты), у якіх выстаўляліся прыватныя манетныя зборы. Гэтая традыцыя вядомая і на тэрыторыі Беларусі – у Нясвіжскім палацы Мікалаем Радзівілам Чорным (1515–1565) ствараецца адзін з першых нумізматычных збораў на беларускіх землях. Значнай калекцыяй манет валодаў і магнацкі род Сапегаў. Нумізматычныя калекцыі былі і ў іншых прадстаўнікоў заможных шляхецкіх родаў [3, с.16–20].

Тагачасныя нумізматычныя калекцыі складаліся ў асноўным з антычных манет. Калекцыйны матэрыял, нейкім чынам апрацаваны і сістэматызаваны, быў прызначаны для вузкага кола наведвальнікаў.

Пад уплывам ідэй Асветніцтва з другой паловы XVIII ст. пачынае развівацца новая стадыя прыватнага калекцыяніравання. Уладальнікі манетных збораў імкнуцца папулярызаваць свае калекцыі, прадстаўляючы іх у невялікіх прыватных музеях.

Парэформенны час адзначаецца пэўнай дэмакратызацыяй сацыяльнага складу калекцыянераў, помнікі гісторыі праходзяць навуковую атрыбуцыю, дэманструюцца шырокім колам гледачоў. Значнай з'явай стала імкненне да асэнсаванага збору і вывучэння мясцовага беларускага матэрыялу.

У другой палове XIX ст. шырока разгортваецца стварэнне музеяў з дэманстрацыяй старажытных манет. У 1842 г. адкрываецца прыватны музей Тышкевічаў у Лагойску. У далейшым Я. Тышкевіч (1814–1873) перадае сямейную калекцыю манет у заснаваны яго намаганнямі Віленскі музей старажытнасцей [2; 7, с.47–56]. Нумізматычная калекцыя гэтага музея актыўна папаўнялася і складалася з дзвюх частак – манетнай і скарбавай, прычым у абсалютнай большасці гэта былі дэпазіты, адкрытыя на тэрыторыі беларускіх губерняў. Улічваючы, што з 1855 г. па 1915 г. калекцыя манет з музея неаднаразова часткова вывозілася ў іншыя музейныя ўстановы, яе колькасныя паказчыкі маглі б дасягнуць некалькіх дзясяткаў тысяч экзэмпляраў.

Значныя нумізматычныя калекцыі XIX ст. уваходзілі ў музейныя зборы М. П. Румянцава (1754–1826) і І. Ф. і Ф. І. Паскевічаў (1782–1856; 1823–1903) у Гомелі. Гэтыя нумізматычныя зборы складаліся з асобных манет і скарбаў, знойдзеных на тэрыторыі Беларусі [14, с.6]. Калекцыя М. П. Румянцава ў далейшым перавозіцца ў Пецярбург, а музейны збор Паскевічаў становіцца асновай фондаў будучага Гомельскага абласнога краязнаўчага музея.

Збіральнікам нумізматычных калекцый з'яўляўся граф Эмерык фон Гутэн-Чапскі (1828–1896) [13]. Выдатная нумізматычная калекцыя манет, сабраная ім, выстаўлялася ў прыватным музеі ў маёнтку Станькава недалёка ад Мінска. Трэба адзначыць, што ўладальнік калекцыі складаў і выдаваў для наведвальнікаў свайго прыватнага музея спецыяльныя манетныя каталогі.

Э. фон Гутэн-Чапскі быў вядомы і як адзін з арганізатараў, заснавальнікаў і мецэнатаў Нумізматычнага таварыства, створанага ў 1888 г. у Кракаве. Частка нумізматычнай калекцыі Гутэн-Чапскага была перададзена ўладальнікам у Кракаў, дзе захоўваецца і зараз у фондах Нацыянальнага музея.

Аматарскае калекцыяніраванне манет у Беларусі існуе і ў XX ст. Вядомым збіральнікам нумізматычных помнікаў у пачатку XX ст. быў віцебскі калекцыянер, першы дырэктар сучаснага Віцебскага абласнога краязнаўчага музея А. Р. Брадоўскі (1859–1928).

У Савецкай Расіі з 1921 г. калекцыянеры-нумізматы ўваходзілі ў філатэлістычную асацыяцыю. У 1930-я гг. дзейнасць гэтай арганізацыі была спынена. З 1966 г. па 1969 г. у складзе Усесаюзнага таварыства філатэлістаў дзейнічала секцыя калекцыянераў-нумізматаў. У 1990 г. ствараецца Усесаюзнае аб'яднанне калекцыянераў (Масква) і Усесаюзнае аб'яднанне клубаў нумізматаў (Калінінград). У сярэдзіне 1990-х гг. было заснавана «Беларускае нумізматычнае таварыства» (г. Гродна), якое з 2000 г. з'яўляецца рэспубліканскім грамадскім аб'яднаннем [6, с.37].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На фоне развіцця працэсу прыватнага калекцыяніравання манет у XIX ст. складаюцца буйныя музейныя нумізматычныя зборы.

У Расіі пытаннямі фіксацыі нумізматычных помнікаў займалася Маскоўскае таварыства гісторыі і старажытнасцей расійскіх (1804), Рускае археалагічнае таварыства (1846), Імператарская археалагічная камісія (1859).

Нумізматычныя калекцыі з'явіліся, напрыклад, у музеях Віцебскага (1868) і Гродзенскага (сярэдзіна 1860-х гг.) статыстычных камітэтаў. Калекцыйны матэрыял у гэтых музеях праходзіў першасную апрацоўку.

Нумізматычныя калекцыі захоўваліся і ў царкоўна-археалагічных музеях, што ствараліся ў губернскіх гарадах Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. Найбольш значныя з іх захоўваліся ў Магілёўскім (1897) і Мінскім (1908) царкоўна-археалагічных сховішчах.

Нумізматычныя калекцыі існавалі і ў музеях навучальных устаноў – у Клімавіцкай гімназіі (1911), Мсціслаўскай духоўнай семінарыі (1915) і інш.; яны мелі дыдактычны характар і спрыялі засваенню тэарэтычных ведаў.

Канец XIX – пачатак XX ст. быў часам асэнсавання шырокага паказу музейных калекцый. Музеі становяцца ўстановамі, якія займаюцца пытаннямі рэгістрацыі і захавання асобных манет і скарбаў. Агульнае развіццё музейнай справы ў гэты перыяд сведчыць аб дастаткова высокім узроўні навуковай апрацоўкі нумізматычнага матэрыялу. Вывучэнне нумізматычных помнікаў садзейнічала больш глыбокаму і ўсебаковаму даследаванню гісторыі Вялікага Княства Літоўскага.

Значнае месца ў гісторыі музейнай справы і музейнага нумізматычнага калекцыяніравання XX ст. займае Віленскі беларускі гісторыка-этнаграфічны музей імя І. І. Луцкевіча [3, с.34–36]. Асновай яго фондаў стала калекцыя І. Луцкевіча (1881–1919), у якую ўваходзіла і манетная частка. Гэты музей, як і Віленскі музей старажытнасцей, стаў працягам здзяйснення ідэі стварэння музея беларускай гісторыі.

На тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд склаліся спрыяльныя ўмовы для развіцця музейнага нумізматычнага збіральніцтва. Папулярызатарам нумізматычных ведаў у Гродзенскім рэгіёне стаў Ю. Ядкоўскі (1890–1950) [6, с.36]. Даследчык ахвяруе ў тагачасны Гродзенскі музей сваю калекцыю нумізматычных помнікаў.

У СССР фіксацыяй і навуковай апрацоўкай помнікаў нумізматыкі займаліся музейныя і акадэмічныя ўстановы: Камісія па нумізматыцы і гліптыцы пры Дзяржаўнай акадэміі гісторыі матэрыяльнай культуры (1918–1929), асноўнымі навуковымі цэнтрамі з'яўляліся Дзяржаўны Эрмітаж (Ленінград) і Дзяржаўны гістарычны музей (Масква).

Значнай нумізматычнай калекцыяй, якая складалася з асобных манет і манетных скарбаў, знойдзеных на тэрыторыі Беларусі, валодаў Беларускі дзяржаўны музей (БДМ), створаны ў 1923 г. Фонды музея былі сфарміраваны на падставе калекцый Мінскага гарадскога і царкоўна-археалагічнага музеяў.

Падчас Вялікай Айчыннай вайны амаль поўнасцю быў знішчаны музейны нумізматычны фонд Беларусі.

У другой палове XX ст. у Беларусі сфарміраваліся тры цэнтры музейнага нумізматычнага калекцыяніравання:

1. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь – захоўвае больш за 52 тысячы экзэмпляраў манет і 118 манетна-рэчавых скарбаў.

2. Нумізматычны кабінет Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта – прадстаўляе сістэматызаваны збор манет, які налічвае каля 7 тысяч манет і 40 манетных скарбаў.

3. Музей Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь захоўвае каля 20 манетна-рэчавых скарбаў [9].

Значныя нумізматычныя зборы захоўваюцца ў фондах беларускіх абласных музеяў, напрыклад, нумізматычная калекцыя Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея складаецца больш чым з 18 тысяч адзінак захоўвання і больш за 20 манетна-рэчавых скарбаў, нумізматычная калекцыя Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея налічвае каля 30 тысяч адзінак захоўвання. Вопыт гэтых музеяў у захаванні і экспанаванні нумізматычных помнікаў можа быць выкарыстаны ў дзейнасці рэгіянальных музеяў.

Развіццё музейнага нумізматычнага калекцыяніравання немагчыма без развіцця навуковых ведаў. Асновы навуковай нумізматыкі ў канцы XVIII ст. былі закладзены абатам,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прафесарам класічнай археалогіі Венскага ўніверсітэта, дырэктарам Імператарскага мюнцкабінета ў Вене Ёзафам Хіларыем Экелем (1737–1798) [12, с.15]. У сямітомнай працы «Вучэнне аб старажытных манетах» (1792–1798) Экель распрацаваў асновы гісторыка-геаграфічнага прынцыпу ў апрацоўцы нумізматычнага матэрыялу.

Заснавальнікамі беларускай навуковай нумізматыкі з’яўляюцца П. В. Харламповіч (1884–?) і М. М. Шчакаціхін (1896–1940), якія здолелі даказаць самастойнасць грашовай сістэмы Вялікага Княства Літоўскага.

У канцы 1920-х гг. П. В. Харламповічам былі надрукаваны два артыкулы з інфармацыяй аб манетных скарбах, якія захоўваліся ў фондах Беларускага дзяржаўнага музея, і знаходках на тэрыторыі Беларусі пражскіх грошай [17; 18].

М. М. Шчакаціхін, працягваючы пачатую П. В. Харламповічам распрацоўку праблем беларускай нумізматыкі, напісаў тры навуковыя артыкулы па гісторыі грашовага абарачэння на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага. Абодва даследчыкі былі рэпрэсіраваны ў канцы 1920-х – 1930-я гг.

У другой палове ХХ ст. традыцыі, закладзеныя заснавальнікамі беларускай навуковай нумізматыкі, працягвае В. Н. Рабцэвіч. Менавіта яго намаганнямі нумізматыка Беларусі пераўтварылася ў самастойную гістарычную навуку, якая даследуе шырокае кола пытанняў.

Задача сучаснай нумізматыкі – комплекснае даследаванне, якое ўключае не толькі ўсебаковае вызначэнне манет, але і высвятленне пэўных аспектаў гістарычнага і эканамічнага развіцця рэгіёна.

Шэраг беларускіх рэгіянальных музеяў маюць у сваіх зборах нумізматычныя калекцыі. Гэта:

– Барысаўскі аб’яднаны музей, Вілейскі гісторыка-краязнаўчы музей, Лагойскі гісторыка-краязнаўчы музей імя К. і Я. Тышкевічаў, Любанскі музей народнай славы, Нясвіжскі гісторыка-краязнаўчы музей (Мінская вобласць);

– Касцюковіцкі краязнаўчы музей, Круглянскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей, Крычаўскі раённы краязнаўчы музей, Чавускі раённы гісторыка-краязнаўчы музей (Магілёўская вобласць);

– Ашмянскі краязнаўчы музей імя Ф. К. Багушэвіча, Ваўкавыскі ваенна-гістарычны музей імя П. І. Баграціёна, Дзятлаўскі дзяржаўны гісторыка-краязнаўчы музей, Карэліцкі раённы краязнаўчы музей «Зямля і людзі», Лідскі гісторыка-мастацкі музей, Мастоўскі музей «Лес і чалавек», Навагрудскі гісторыка-краязнаўчы музей, Свіслацкі гісторыка-краязнаўчы музей, Смаргонскі гісторыка-краязнаўчы музей (Гродзенская вобласць);

– Лельчыцкі раённы краязнаўчы музей, Рагачоўскі музей народнай славы, Рэчыцкі краязнаўчы музей (Гомельская вобласць);

– Браслаўскае раённае аб’яднанне музеяў, Музейны комплекс гісторыі і культуры Аршаншчыны, Полацкі краязнаўчы музей (Віцебская вобласць);

– Баранавіцкі краязнаўчы музей, Бярозаўскі гісторыка-краязнаўчы музей, Івацэвіцкі гісторыка-краязнаўчы музей, Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворава, Музей Беларускага Палесся, Столінскі краязнаўчы музей (Брэсцкая вобласць).

У наш час станоўчы вопыт атрыбуцыі асобных манет і манетных скарбаў і выкарыстанне іх у некаторых формах культурна-адукацыйнай дзейнасці адзначаюцца ў рэгіянальных музеях Гродзенскай, Віцебскай і Брэсцкай абласцей.

Паводле даных старшыні Беларускага нумізматычнага таварыства, у Гродзенскай вобласці намаганнямі спецыялістаў праведзена маштабнае вывучэнне нумізматычных калекцый, што захоўваюцца ў фондах раённых музеяў. Праведзены сістэматызацыя, каталагізацыя і атрыбутаванне нумізматычнага матэрыялу [5]. Значная работа па апрацоўцы нумізматычнай калекцыі праводзіцца ў музеі Беларускага Палесся (г. Пінск), апрацаваны скарбы рускіх капеек XVII ст. у музейным комплексе «Гісторыя і культура Аршаншчыны» (г. Орша) [8]. Гэтыя прыклады сведчаць аб тым, што стварэнне спрыяльных умоў з боку кіраўніцтва музеяў і далучэнне да навуковай апрацоўкі манет і манетных скарбаў спецыялістаў даюць добры плён у напрамку выкарыстання нумізматычных помнікаў у культурна-адукацыйнай дзейнасці беларускіх рэгіянальных музеяў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Беляков, А. С.* Нумизматика / А. С. Беляков // Введение в специальные исторические дисциплины. – М.: Изд-во МГУ, 1990. – С. 81–146.
2. *Грималаускайте, Д.* Собрание нумизматики Виленского музея древностей / Д. Грималаускайте // Международная нумизматическая конференция, посвященная 150-летию Национального музея Литвы, Вильнюс, 26–28 апр. 2006 г. – Вильнюс, 2006. – С. 40–41.
3. *Гужалоўскі, А. А.* Нараджэнне беларускага музея / А. А. Гужалоўскі. – Мінск: НАРБ, 2001. – 124 с.
4. *Зварич, В. В.* Нумизматический словарь / В. В. Зварич. – Львов: Вища шк., 1976. – 156 с.
5. *Какареко, В.* Нумизматические коллекции Гродно и Гродненщины / В. Какареко // Rozwoj muzealnictwa I kolekcjonerstwa numizmatycznego – dawneji dzis – na Bialorusi, Litwie, w Polsce i Ukraine: materialy z II Miedzynarodowej konferencji numizmatycznej. – Warszawa, 1997. – S. 31–50.
6. *Какареко, В.* Нумизматическое движение в Беларуси / В. Какареко // Банкаўскі веснік. – 2003. – № 11. – С. 33–38.
7. *Каханоўскі, Г. А.* Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI–XIX стст. / Г. А. Каханоўскі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1984. – 118 с.
8. *Кобринец, В. А.* «Чистые» клады российских монет XVII в. на Витебщине / В. А. Кобринец // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: матэрыялы V Міжнар. канф., Полацк, 24–25 кастр. 2007 г. – Полацк, 2009. – С. 90–91.
9. *Памятныя* манеты Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь. 1996–2006. – Мінск: Транстэкс, 2008. – 215 с.
10. *Потин, В. М.* Введение в нумизматику / В. М. Потин // Труды Государственного Эрмитажа. – Л., 1986. – Т. 26. – Вып. 6. – С. 69–162.
11. *Потин, В. М.* Монета в быту, обычаях и верованиях Руси X–XVII вв. / В. М. Потин // Экономика, политика и культура в свете нумизматики: сб. науч. тр. – Л.: Изд-во Гос. Эрмитажа, 1982. – С. 78–99.
12. *Потин, В. М.* Монеты. Клады. Коллекции: очерки нумизматики / В. М. Потин. – СПб.: Искусство-СПБ., 1992. – 303 с.
13. *Рябцевич, В. Н.* Монеты с контрамаркой Е. Гуттен-Чапского в собрании Национального музея США при Смитсоновском институте (Вашингтон) / В. Н. Рябцевич // Pieniądz pamiętkowy i okolicznościowy – Wspólnota dziejów – Białoruś – Litwa – Łotwa – Ukraina, Supraśl, 7–9. IX. 2000: materiały z IV Międzynarodowej konferencji numizmatycznej. – Warszawa, 2000. – S. 145–152.
14. *Рябцевич, В. Н.* Нумизматика Беларуси / В. Н. Рябцевич. – Минск: Полымя, 1995. – 687 с.
15. *Спасский, И. Г.* Русская монетная система / И. Г. Спасский. – Л.: Аврора, 1970. – 256 с.
16. *Фенглер, Х.* Словарь нумизмата / Х. Фенглер, Г. Гироу, В. Унгер. – М.: Радио и связь, 1982. – 328 с.
17. *Харламповіч, П. В.* Манэтныя скарбы, знойдзеныя ў Беларусі, у зборах Беларускага дзяржаўнага музэю / П. В. Харламповіч // Гісторычна-археолёгічны зборнік. – Менск, 1927. – № 1. – С. 305–343.
18. *Харламповіч, П. В.* Праскія грошы ў беларускіх манэтных скарбах // Гісторычна-археолёгічны зборнік. – Менск, 1927. – № 1. – С. 295–302.

*I. KOLABAVA*

## NUMISMATIC COLLECTIONS IN CULTURAL AND EDUCATIONAL ACTIVITY OF THE REGIONAL MUSEUMS

The main stages of the history of private and museum numismatic gathering, the development of the scientific numismatics of Belarus are reported; the problems of the preservation, popularization and usage of the numismatic gathering in the cultural and educational activity of the regional museums of Belarus are analyzed; a positive experience of

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

some regional museums of the country in the work of treatment and popularization of the numismatic collections is given.

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 26.09.2011.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ